УДК 737:069.5(476-25)

# СКАРБЫ З ШЭЛЯЖНАЙ МАНЕТАЙ Ў ЗБОРАХ МУЗЕЯ БЕЛАРУСКАГА ПАЛЕССЯ

***Раман Крыцук***
*Мінск, Беларусь*

Артыкул прысвечаны праблемам грашовых дэпазітаў з шэляжнай манетай на прыкладзе шасці грашовых дэпазітаў са збораў Музея беларускага Палесся. У навуковы абарот уводзяцца раней не апублікаваныя крыніцы, якія дазваляюць адкрыць новую старонку ў гісторыі грашовага абарачэння II-ой паловы XVII стагоддзя. Не гледзячы на тое, што скарбы з шэлягамі XVII стагоддзя з'яўляюцца аднымі з самых масавых грашовых дэпазітаў на тэрыторыі Беларусі, яны слаба вывучаны беларускімі нумізматамі.

***Ключавыя словы: Музей Беларускага Палесся, скарб, шэляг, XVII ст.***

Калекцыя скарбаў Музея Беларускага Палесся (далей МБП) даволі слаба даследаваная – частка скарбаў схематычна апісаныя ў польскамоўным артыкулы Валянціна Навумавіча Рабцэвіча 1988 г. Адметнай рысай музейнага збору з'яўляецца наяўнасць даваенных скарбаў, якія паступалі з моманту заснавання музея ў 1926 г. На жаль, з-за знішчэння даваенных музейных кніг, некаторыя комплексы былі дэпаспартызаваныя. Сярод агульнай масы скарбаў асобна выдзяляюцца скарбы з шэлягамі XVII ст.

Шэляг – ( солід, ад лац. Solidus – трывалы, масіўны) першасна залатая манета, якую адбіў імператар Канстанцін I каля 309 г. ў горадзе Цpip. З 314 г. шэляг пачалі біць па ўсей тэрыторыі Усходняй імперыі. Яго вага раўнялася 4,55 г. золата, і заставалася такой канца Візантыйскай імперыі (за выключэннем кіравання Міхаіла VII 1071–1078). Солід паўплываў на грашовы абарот ва Фларэнцыі і Венецыі, а таксама ва ўсей Заходняй і Цэнтральнай Еўропе [1]. Нетрывалыя дзяржаўныя ўтварэнні часоў Вялікага перасялення народаў (350–600 гг.) выкарыстоўвалі солід як асноўную залатую манету. Меравінгскія правадыры франкаў, лангабарды, вест- і остготы, бунгурды ўзялі за ўзор для чаканкі больш дробную фракцыю соліда – трэмміс (ці трыенс, 1/3 соліда ). На тэрыторыі Еўропы солід з 550 г. пачынаюць называць шылінгам. Афрыканскія вандалы чаканілі соліды з імем Валенцініяна III (425–455) і Анастасія (491–517). Вестготы і лангабарды чаканілі простыя імітацыі. Остгоцкі кароль Тэадорых (471–526) чаканіў імітацыі солідаў Анастасія, але з выявай сваёй манаграмы і пазнакамі менніц Мілана, Равены і Рыма. Бургундскі кароль Гундабард (473–516) – соліды з імям Анастасія і сваёй манаграмай. Франкскі кароль Тэадэберт (543–548) пачаў чаканіць залатыя соліды ад свайго імя ў 544–548. Пасля 580 г. на паўднёвым усходзе Франкскай дзяржавы кошт соліда знізіўся да 21 сіліквы. Манеты з паніжанай вагой імітавалі соліды візантыйскага імператара Маўрыкія (582–602) і біліся да



ПолесГУ

сярэдзіны VII ст. Пры Хлотары II (613–629) вага соліда была паніжаная да 20 сілікв (3,18 г) з азначэннем наміналу рымскімі лічбамі "XX". У далейшым, Франкская дзяржава чаканіла толькі трэміссы. На Русі назва "шэляг" упершыню фіксуецца ў IX і X ст. у Аповесці мінулых гадоў:

*"Посла Олегъ к радимичем, ркя: «Кому дань даете?» Они же рѣша: «Козаром». И рече имъ Олегъ: «Не давайте козаромъ, но мнѣ давайте». И вдаша Олгови по **щелягу**, якоже и козаромъ даяху*" (год 885).

*"И иде на Оку рѣку и на Волгу, и налѣзе вятичи и рече имъ: «Кому дань даете?» Они же ркоша: «Козаром по **щелягу** от рала даем»"* (год 964) [2]

Дагэтуль не зразумела, якую менавіта манету ў Аповесці Мінулых Гадоў называюць шэлягам. Верагодней за ўсё гэта не візантыйскі залаты солід, а больш распаўсюджаны на Русі арабскі срэбраны дзірхам. Дыскусійным застаецца і этымалогія слова "шэляг": ад скандынаўскага "skillingr", верхненямецкага "scilling" ці іўрыту "шэлэг" – белы.

У сярэднявечча шэляг быў упершыню адбіты як ужо срэбраная манета французскім каралём Людовікам IX (1226–1270) у 1266 г. пад назвай "grossus denarius turonensis". На тэрыторыі Германіі шэляг існаваў як разліковы намінал, які раўняўся 12 пфенігам/дэнарыям (стар. бел. - пенязям). Ва Усходняй Еўропе шэлягі ўпершыню з'явіліся ў Тэўтонскім ордэне пры вялікім комтуры Вінрыху фон Кніпродзе (1351–1382 гг.) [3]. Першыя эмісіі шэлягаў у Польскім Каралеўстве (мясц. назва - szeląg) адбыліся пад час кіравання Казіміра Ягелончыка – у перыяд Трыццацігадовай вайны (1454 – 1466 гг.), у прускіх гарадах Торуні, Гданьску і Эльблёнгу [4, s. 20]. Першыя шэлягі ВКЛ з'яўляюцца ў 1579 г., пад час манетнай рэформы Стэфана Баторыя – вартасць манеты адпавядала 1/3 гроша, і мела 0,18 г срэбра пры агульнай вазе 1,3 г.[5]. Пры Яне Казіміры шэляг ВКЛ б'ецца як білонавая[5] так і медная манета. Медныя шэлягі называюцца барацінкамі, ад прозвішча ініцыятара грашовай рэформы Ціта Лівія Бараціні. Гэтыя манеты склалі апошнюю масавую грашовую эмісію ВКЛ.

Скарбы з білонавымі і меднымі шэлегамі Рэчы Паспалітай, Шведскіх Інфлянтаў і Прусіі з'яўляюцца аднымі з самых масавых комплексаў, якія знаходзілі і знаходзяць на тэрыторыі Беларусі. Да 1941 года, некаторыя з скарбаў былі апублікаваны ў тапаграфічных зводах Паўла Васільевіча Харламповіча (у асноўным гэта былі скарбы з збору Беларускага Дзяржаўнага Музея)[6] і Рыхарда Рычардавіча Фасмера[7]. Артыкул Р. Фасмера па большасці абапіраўся на публікацыю П.В. Харламповіча. Асобную працу па фіксацыі скарбаў правёў рэпрэсаваны ў савецкія часы беларускі мастацтвазнаўца Мікалай Мікалаевіч Шчахаціхін. З-за заўчаснай смерці аўтара ў 1940 г., пад часы высылкі ў г. Белябей Башкірскай АССР, яго рукапіс не быў апублікованы. Арыгінал працы М. Шчахаціхін перад сваёй смерцю паспеў выслаць у аддзел нумізматыкі Дзяржаўнага Эрмітажа ў Ленінградзе. Копія рукапісу, намаганнямі В. Н. Рабцэвіча ў 2-ой палове 2000-х г., была перададзена ў архіў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь[8]. У пасляваенны час, скарбы з шэлегамі былі апублікаваны ў тапаграфічных зводах В.Н. Рабцэвіча[9; 10; 11], асобныя скарбавыя комплексы публікаваліся Іванам Іванавічам Сінчуком[12]. Пры гэтым, дагэтуль адсутнічае агульная праца, якая б змагла б аб'яднаць вынікі іх даследаванняў. Большая частка скарбаў са збораў беларускіх музеяў, дагэтуль не апублікаваная, альбо апублікаваная толькі часткова.

У зімку 2016 г., аўтару артыкула атрымалася апрацаваць 6 скарбаў пераважна з шэляжнай манетай з збораў МБП. З-за абмежаванага перыяду часу, апрацаваць ўсе дэпазіты з шэлягамі не атрымалася[6]. Атрыбуцыя каронных і літоўскіх барацінак адбывалася пры дапамозе працы Цэзарыя Вольскага "Miedziane szelągi Jana Kazimierza Wazy z lat 1659-1667"[13]. Пры атрыбуцыі шэлягаў Шведскіх Інфлянтаў выкарыстоўвалася

[5] Нізкапробнае срэбра, менш за 500 пробу.

[6] Напрыклад адзін з даваенных скарбаў (КП 2988) складае больш за 6 тысяч манет. Толькі для яго апрацоўкі патрэбна некалькі месяцаў працы.

каталог Фёдарава "Монеты Прибалтики XIII–XVIII столетий"[14], а атрыбуцыя фальшывых шэлягаў адбітых на менніцы г. Сучава (Малдоўскае княства) пры дапамозе каталога "Monede si bancnote romanesti"[15] і сайта "The coins of Moldavia and Vallachia"[16] . Інфармацыя пра месца знаходкі некаторых даваенных скарбаў не захавалася з-за праведзенай ў 1950 г. музейнай агульнасаюзнай замене інвентарных кніг. У новыя інвентарныя кнігі часам трапляла толькі частка інфармацыі а старыя кнігі у большасці выпадкаў знішчаліся. З-за гэтага часткова былі дэпаспартызаваныя музейныя зборы нават буйных музеяў, такіх як Дзяржаўны Эрмітаж і Дзяржаўны Гістарычны Музей ў Маскве.

1. Скарб знойдзены ў 1932 г. у Давыд-Гарадку ў гліняным гаршку (Інвентарны нумар КП 3442/001-192, захавалася 192 манета). Частка манет пачышчаная, некаторыя манеты зацёртыя. На не пачышчаных манетах прысутнічаюць вокіслы і адбіткі вокіслаў з іншых манет.

Склад скарба наступны:

*Манетападобны кружок (5 адз.).*

*Шэляг білонавы, моцна зацёрты, атрыбуцыі не паддаецца.*

*Бараціна моцна зацёртая, атрыбуцыі не паддаецца (21 адз.).*

**Шведскія Інфлянты, Рыга:**

*Густаў II Адольф (1611-1632) шэляг 16XX*[7].

*Хрысціна Аўгуста (1632-1654), шэляг 16XX(2 адз.); 16X2; 163X; 1641; 1646(2 адз);1652; 1653 (2 адз); 1654.*

*Карл XI (1660-1697) шэляг 1660 (2 адз.).*

**Шведскія Інфлянты, Лівонія:**

*Хрысціна Аўгуста (1632-1654),шэляг 1649; 1650.*

**Рэч Паспалітая, Карона Польская:**

*Ян II Казімір Ваза (1648-1668): шостак 1667 г. TLB.*

**Фальшывыя манеты:**

*Каронныя бараціні з датамі: "16XX"(11 адз.); "166"; "1665"(2 адз.).*

*Літоўскія бараціні з датамі: "16XX"(3 адз.); "16XX HKPL"; "1661 TLB HKPL"*[8]*; "1666 HKPL".*

Каронныя і літоўскія эмісіі медных шэлягаў 1659-1666 гг. прадстаўлены ў табліцы № 1 і № 2.

*Табліца № 1. Эмісіі каронных барацінак 1659-1666*

| Менніца | Год эмісіі | Колькасць манет |
|---|---|---|
| Уяздаў | 1659 | |
| | 1660 | |
| | 1661 | |
| | 1663 | 1 |
| | 1664 | 12 |
| | 1665 | 10 |
| | дата не захавалася | |
| Кракаў | 1659 | |
| | 1660 | |
| | 1661 | 1 |
| | дата не захавалася | |
| Моцна зацёртыя | | 29 |

[7] У нумізматыцы літара "X" пазначае не захаваўшуюся лічбу даты.

[8] На дадзенай манеце герб "Пагоня" аналагічны манетам з Віленскай менніцы.



ПолесГУ

*Табліца № 2. Эмісіі барацінак ВКЛ 1660-1666*

| Менніца | Год эмісіі | Колькасць манет |
|---|---|---|
| Уяздаў | 1660 | |
| | 1661 | 2 |
| | дата не захавалася | 1 |
| Аліва | 1663 | 5 |
| Вільня | 1664 | 5 |
| | 1665 | 9 |
| | 1666 | 6 |
| | 166 | |
| | дата не захавалася | 8 |
| Брэст | 1665 | 1 |
| | 1666 | 5 |
| | 166 | |
| | дата не захавалася | 5 |
| Коўна | 1665 | |
| | 1666 | |
| | дата не захавалася | |
| Мальбарк | 1666 | 1 |
| Моцна зацёртыя | | 27 |

Большую частку скарба складаюць барацінкі ВКЛ – 75 манет (39 % ). На другім месцы каронныя барацінкі – 53 манеты (27,6 %). Акрамя таго атрыбутаваць 21 барацінку (10,9 %) не магчыма з-за іх дрэннага стану. 20 барацінак (10,4 %) з'яўляюцца тагачаснымі падробкамі. Эмісіі Шведскіх Інфлянтаў прадстаўлены 21 шэлягам (10,9 %). 6 манет захаваліся ў выглядзе манетападобных кружкоў. Адзіная не шэляжная манета, гэта каронны шостак 1667 г. Яна з'яўляецца самай малодшай манетай у складзе скарба і дазваляе датаваць час захавання скарба як 1667-1680 гг. Цалкам верагодна, што ў складзе скарба былі і іншыя буйныя наміналы, якія разышліся сярод знаходчыкаў скарба і не дайшлі да музейнага збору.

2. Скарб знойдзены да 1941 г., на тэрыторыі Пінскага ваяводства. Інвентарны нумар 03694/01-90, захавалася 90 манет. Скарб цалкам пачышчаны, некаторыя манеты моцна зацёртыя.

Склад скарба наступны:

**Рэч Паспалітая, Карона Польская:**

*Жыгімонт ІІІ Ваза(1587-1632): тэрнарыі г. Лабжэніца 16ХХ (3 адз.), 1624, 1630 (2 адз.); тэрнарый г. Поздань 1627.*

*Шэлягі г. Быдгашч 16ХХ, 162Х, 1623 (3 адз.),1624, 1626 (3 адз.), 1627.*

**Рэч Паспалітая, ВКЛ:**

*Жыгімонт ІІІ Ваза: шэлягі г. Вільня 16ХХ (4 адз.),161Х (2 адз.), 1618, 1619 (2 адз.), 162Х (5 адз.)., 1623 (13 адз.), 1624 (14 адз.),1625, 1626, 1627 (2 адз.).*

**Фальшывыя манеты адбітыя на менніцы г. Сучава:**

*Віленскія шэлягі Яна ІІ Казіміра з датамі: "дата не бачна", "1652", "60".*

Літоўскія эмісіі медных шэлягаў 1659-1666 гг. прадстаўлены ў табліцы № 3

*Табліца № 3. Эмісіі барацінак ВКЛ 1660-1666*

| Менніца | Год эмісіі | Колькасць манет |
|---|---|---|
| Уяздаў | 1660 | |
| | 1661 | 2 |
| | дата не захавалася | |
| Аліва | 1663 | 2 |
| Вільня | 1664 | 1 |
| | 1665 | 3 |

| | | |
|---|---|---|
| | 1666 | 4 |
| | 166 | |
| | дата не захавалася | 1 |
| Брэст | 1665 | |
| | 1666 | 1 |
| | 166 | |
| | дата не захавалася | 1 |
| Коўна | 1665 | |
| | 1666 | |
| | дата не захавалася | |
| Мальбарк | 1666 | |
| Моцна зацёртыя | | 15 |

Літоўскія і каронныя эмісіі Жыгімонта III складаюць большую частку скарба (45 манет - 50 % і 17 манет - 18,8 %). Літоўскія барацінкі складаюць другую па колькасці масу манет – 25 адз. (27,7 %). Толькі 3 манеты з складу скарба з'яўляюцца фальшывымі. Самая малодшая манета скарба датуецца 1666 г., якая дазваляе датаваць час захавання скарба як 1666-1680 гг. Дадзены скарб выдзяляецца сярод іншых дэпазітаў з-за адсутнасці каронных барацінак і вялікай колькасці літоўскіх шэлягаў Жыгімонта III Вазы і даволі рэдкіх яго-ж каронных тэрнарыяў. Верагодна што захавалася толькі частка скарба, альбо дадзены скарб з'яўляецца кампіляцыяй з двух скарбаў: пачатку 1630-х гадоў часоў Жыгімонта III Вазы і 1666-1680-х гадоў часоў Яна II Казіміра Вазы і Яна III Сабескага (1674-1696).

3. Скарб знойдзены да 1941 г., на тэрыторыі Пінскага ваяводства. Інвентарны нумар 03697/001-117, захавалася 117 манет. Скарб цалкам пачышчаны, некаторыя манеты моцна зацёртыя.

Склад скарба наступны:

*Шэляг білонавы, моцна зацёрты, атрыбуцыі не паддаецца (2 адз).*

**Прусія (герцагства):**

*Георг Вільгельм(1619-1640): шэляг 16XX (3 адз.) 1626, 1627, 1628(2 адз.), 1629(4 адз.), 1630, 1633(2 адз).*

**Акупаваны шведамі Эльблёнг:**

*Густаў II Адольф: шэляг 16XX (4 адз.) 16X0,163X, 1632, 1633.*

*Хрысціна Аўгуста: шэляг 1635.*

**Шведскія Інфлянты, Рыга:**

*Густаў II Адольф: шэляг 16XX (7 адз.), 162X, 1624, 1625, 1626, 1627 (2 адз.), 163X(3 адз.), 1631, 1632, 1633, 1634.*

*Хрысціна Аўгуста: шэляг 16XX(6 адз.), 1649,1651(2 адз), 1654.*

*Карл X Густаў (1654-1660) шэляг 16XX (4 адз.).*

**Шведскія Інфлянты, Лівонія:**

*Хрысціна Аўгуста: шэляг 16XX(6 адз.), 1640[9], 1648, 1649, 1650, 1653 (5 адз).*

*Карл XI: шэляг 1663.*

**Рэч Паспалітая, Рыга:**

*Жыгімонт III Ваза: шэляг 16XX(2 адз), 1616.*

**Рэч Паспалітая, ВКЛ:**

*Жыгімонт III Ваза: шэляг 1919, 1623 (2 адз) 1626.*

*Ян II Казімір: шэляг 1652 г. (2 адз).*

**Фальшывыя манеты:**

*Шэляг, прымітыўная падробка, вызначэнню не паддаецца(2 адз).*

*Барацінка каронная.*

**Фальшывыя манеты адбітыя на менніцы г. Сучава:**

ПолесГУ

[9] Менніца Лівоніі ў царкве Святога Якаба ў Рызе пачала працаваць ў 1644 г., таму верагодна што гэта памылка рэзчыка штэмпеля.

*Рыжскія шэлягі Хрысціны Аўгусты з датамі: "дата не бачна","12", "16"(2 адз), "18", "60","61".*

*Лівонскія шэлягі Хрысціны Аўгусты з датамі: "дата не бачна".*

*Рыжскія шэлягі Карла X Густава з датамі: "дата не бачна", "166", "6", "12"(2 адз.), "16", "60"(3 адз.), "66".*

*Лівонскія шэлягі Карла X Густава з датамі: "XX", "X1", "12".*

*Рыжскія шэлягі Карла XI з датамі: "дата не бачна", "6X".*

*Лівонскія шэлягі Карла XI з датамі: "дата не бачна", "61".*

*Прускія шэлягі Фрыдрыха Вільгельма (1640-1688) з датамі: "дата не бачна" (2 адз).*

*Віленскія шэлягі Яна II Казіміра з датамі: "154", "155" (2 адз).*

Большую частку скарба складаюць шэлягі з шведскіх валоданняў у Інфлянтах – 58 манет (49,5 %). На другім месцы – фальшывыя шэлягі з менніцы г. Сучава – 31 манета (26,4 %). 14 шэлягаў (11,9 %) адбіты ў Прусіі, 9(7,6 %) – у Рэчы Паспалітай. 3 манеты – падробкі, 2 манеты захаваліся ў выглядзе манетападобных кружкоў. Самая малодшая манета скарба датуецца 1663 г. Яна дазваляе датаваць час захавання скарба як 1663-1680 гг. Склад дадзенага скарбу цудоўна адлюстроўвае маштаб дзейнасці шведскіх менніц ў г. Рыге (Шведскія Інфлянты) і падпольнай менніцы ў г. Сучаве (Малдоўскае Княства).

4.Скарб знойдзены да 1941 г., на тэрыторыі Пінскага ваяводства. Інвентарны нумар 03722/001-247, захавалася 247 манет. Частка манет пачышчаная, манеты пакрыты вокісламі, на некаторых манетах прысутнічаюць адбіткі іншых манет.

Склад скарба наступны:

*Манетападобны кружок.*

*Шэляг білонавы, моцна зацёрты, атрыбуцыі не паддаецца (25 адз).*

*Зацёрты шэляг Рыгі 16XX г(5 адз.),166X.*

*Зацёртыя шэлягі Хрысціны Аўгусты (6 адз).*

*Зацёрты шэляг Хрысціны Аўгусты 1654.*

*Зацёртыя шэлягі Карла X Густава (5 адз).*

*Зацёрты шэляг Карла X Густава 16X9.*

*Зацёртыя шэлягі Карла XI (3 адз.).*

**Прусія:**

*Фрыдрых Вільгельм: 16XX г.(3 адз).*

**Шведскія Інфлянты, Рыга:**

*Густаў II Адольф: шэляг 16XX.*

*Хрысціна Аўгуста: шэляг 16XX (11 адз), 165X, 1651, 1655 (2 адз). Асобна трэба выдзеліць рыжскі шэляг з незвычайнай легендай:*

*Av: "SO·L·I·D·V·SCIVIRIG…".*

*Rv: "C˙H˙R˙I˙S˙T˙I˙N˙A˙D˙GR".*

*Карл X Густаў: шэляг 16XX (4 адз.),1655 (2 адз), 1657(2 адз), 1658(3 адз), 1659, 1660 (2 адз).*

*Карл XI: шэляг 16XX (11 адз.),166X.*

**Шведскія Інфлянты, Лівонія:**

*Хрысціна Аўгуста: шэляг 16XX (4 адз), 1651, 1652(3 адз.), 1653, 1654.*

*Карл X Густаў: шэляг 16XX (3 адз).*

*Карл XI: шэляг 16XX (4 адз.), 1660, 1661.*

**Рэч Паспалітая, Рыга:**

*Жыгімонт III Ваза: Шэляг 16XX.*

**Рэч Паспалітая, ВКЛ:**

*Ян II Казімір: шэляг 1652 г.(2 адз.).*

**Фальшывыя манеты:**

*Фальшывы рыжскі шэляг (2 адз.).*

*Фальшывы рыжскі шэляг Хрысціны Аўгусты.*

*Фальшывы рыжскі шэляг Густава II Адольфа.*

**Фальшывыя манеты адбітыя на менніцы г. Сучава:**

*Рыжскія шэлягі Хрысціны Аўгусты з датамі: "дата не бачна" (27 адз),"6","X0", "1X"(2 адз), "12"(2 адз), "14", "16"(14 адз) "18", "43", "55"(2 адз), "56", "57", "58", "6X", "60" (16 адз), "61", "166", "661".*

*Лівонскія шэлягі Хрысціны Аўгусты з датамі: "дата не бачна", "56", "57", "61"(2 адз), "62".*

*Рыжскія шэлягі Карла X Густава з датамі: "дата не бачна" (6 адз.),"2", "X0", "1X", "12" (2 адз.), "16"(5 адз), "60", "62"(2 адз.), "165", "168".*

*Лівонскі шэляг Карла X Густава з датай: "16".*

*Зацёртыя шэлягі Карла X Густава (2 адз).*

*Рыжскія шэлягі Карла XI з датамі: "дата не бачна"(3 адз.), "X0", "16"(2 адз.), "51", "166", "6X", "60"(2 адз.), "61", "67".*

*Лівонскі шэляг Карла XI з датай: "58".*

*Пруськія шэлягі Фрыдрыха Вільгельма з датамі: "дата не бачна"(3 адз.), "14", "16".*

*Зацёрты шэляг з датай: "166".*

*Зацёрты шэляг Рыгі з датай: "12".*

*Зацёрты шэляг Прусіі.*

*Гібрыдны шэляг. Дадзеныя манеты чаканіліся пры дапамозе вальцверка[10]. З-за таго што на адным станку змяшчаліся штэмпеля манет розных краін, часам адбывалася перакрутка валікаў з змяшчэннем штэмпеляў. Гэта прыводзіла да выпуску манет з аверсам і рэверсам розных краін. На манеце з скарба прысутнічаюць дзве выявы аверса рыжскіх шэлягаў.*

*Av: малы герб Рыгі, кругавая легенда: "SOLIDVSCIV…".*

*Rv: малы герб Рыгі, кругавая легенда: "COLIDVSCIVIRIC 16(6 ляжыць на баку)".*

Большую частку скарба складаюць фальшывыя шэлягі з менніцы г. Сучава – 128 манет (51,8 %). На другім месцы – шэлягі Шведскіх Інфлянтаў – 62 манеты (25,1 %). Сапраўды вялікая колькасць манет ў скарбе не вызначаецца з-за свайго дрэннага стану захаванасці – 47 манет ( 19 %). 4 манеты з'яўляюцца фальшыўкамі, якія нельга аднесці да шэлягаў Сучавы. Толькі 3 манеты адносяцца да эмісій Рэчы Паспалітай і 3 манеты да эмісій Прусіі. Самая малодшая манета скарба датуецца 1661 г. Менніца ў Сучаве дакладна працавала з 1661 па 1665 гг. Такім чынам скарб быў схаваны ў перыяд з 1661 па 1680-я гг. Колькасць фальшывых манет ў дадзеным скарбе з'яўляецца самай вялікай з апісаных скарбаў – 132 манеты (53,4 %).

5. Скарб знойдзены красавіку 1959 г. у гор. Дзяржынску Мінскай вобл. у гліняным гаршку. Інвентарны нумар КП 4761/01-21, захавалася 21 манета. Перададзены дзецьмі Еўтухову Георгію Аляксандравічу. Цалкам складаецца з барацінак.

**Рэч Паспалітая, Карона Польская:**

*Кракаў: 1659 (?).*

*Уяздаў: 1663 г.; 1665 (4 адз.).*

*Моцна зацёртыя: 16XX (2 адз.).*

**Рэч Паспалітая, ВКЛ:**

*Берасце: 1665 (?), 1666.*

*Вільня: 16XX, 1664 (2 адз.), 1665 (3 адз.), 1666 (2 адз.).*

[10] Вальцверк (ням. Walzenprägewerk, Walzwerk, Druckwerk), станок для біцця манет, як мяркуецца упершыню быў уведзены ў 1550 г. на цірольскай менніцы ў Швебіш-Халле; складаўся з 2 валікаў, злучаных адзін з адным зубчастымі коламі такім чынам, што яны круціліся сінхронна. На валікі было нанесена - у залежнасці ад іх памеру - ад 4 да 19 люстэркавых негатываў аверса і рэверса манеты, пры прапусканні паміж імі металічнага ліста на ім адбіваліся выгравіраваныя на валіках выявы. Пасля вальцоўкі манеты выразалі. Прыкметай чаканкі пры дапамозе вальцверка з'яўляецца нязначная выгнутасць манеты, ці не правільная круглая форма выявы, якую разьбяр штэмпеля павінен быў выразаць выцягнутай, так як у далейшым працэсе вальцаваннем яна падвяргалася плюшчэнню [17].

*Уяздаў: 1661 (2 адз.).*

*Моцна зацёртыя: 16XX.*

Верагодней за ўсё гэта толькі невялікая частка скарбу, які прыкладна можна датаваць перыядам ад 1666 г. па пачатак XVIII ст.

6. Скарб знойдзены ў 1971 г. на правым беразе ракі Прыпяць, у 5 кіламетрах уверх па цячэнню ад г. Пінска, у размыве берага. Інвентарны нумар КП 7702/001-100, захавалася 100 манет. Знойдзены вучнем 6 класа сярэдняй школы № 13 Пінска Марчанка Міхаілам Васільевічам. Манеты моцна пачышчаныя, скарб складаецца толькі з барацінак.

Склад скарба наступны:

*Манетападобны кружок (2 адз).*

*Моцна зацёртыя барацінкі (6 адз).*

**Фальшывыя манеты:**

*Барацінка каронная(2 адз.).*

*Барацінка каронная 1666.*

*Барацінка ВКЛ(4 адз.).*

*Барацінка ВКЛ пад менніцу Брэста (2 адз.).*

*Барацінка ВКЛ пад Віленскую менніцу з датай "XX", "1665".*

*Барацінка ВКЛ з датай "1666" адчаканеная ў г. Бержона (тып "конь з доўгімі нагамі")*

Каронныя і літоўскія эмісіі медных шэлягаў 1659-1666 гг. прадстаўлены ў табліцы № 4 і № 5.

***Табліца № 4. Эмісіі каронных барацінак 1659-1666***

| **Менніца** | **Год эмісіі** | **Колькасць манет** |
|---|---|---|
| Уяздаў | 1659 | |
| | 1660 | 1 |
| | 1661 | 3 |
| | 1663 | 3 |
| | 1664 | 8 |
| | 1665 | 3 |
| | дата не захавалася | |
| Кракаў | 1659 | |
| | 1660 | 1 |
| | 1661 | |
| | дата не захавалася | |
| Моцна зацёртыя | | 20 |

***Табліца № 5. Эмісіі барацінак ВКЛ 1660-1666***

| **Менніца** | **Год эмісіі** | **Колькасць манет** |
|---|---|---|
| Уяздаў | 1660 | |
| | 1661 | 2 |
| | дата не захавалася | 2 |
| Аліва | 1663 | |
| Вільня | 1664 | 3 |
| | 1665 | 5 |
| | 1666 | 3 |
| | 166 | 1 |
| | дата не захавалася | 4 |
| Брэст | 1665 | |
| | 1666 | 3 |
| | 166 | |

ПолесГУ

| | | |
|---|---|---|
| | дата не захавалася | 3 |
| Коўна | 1665 | 1 |
| | 1666 | 5 |
| | дата не захавалася | 2 |
| Мальбарк | 1666 | |
| Моцна зацёртыя | | 7 |

Большую частку скарба складаюць барацінкі ВКЛ – 41 манета (41 %). На другім месцы каронныя барацінкі – 39 манет (39 %). 12 манет з'яўляюцца фальшывымі (12 %), а 7 манет моцна зацёртыя. Скарбы з чыстай меднай шэляжнай манетай датаваць даволі складана, т.я. яны маглі быць захаваныя на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Такім чынам скарб быў схаваны ў перыяд з 1666 па пачатак XVIII ст.

Апрацоўка дадзеных скарбаў з збораў Музея Беларускага Палесся прывяла да наступных высноў:

1. У скарбах, якія цалкам альбо па большасці складаюцца з барацінак, колькасць фальшывых манет раўняецца 10-12 % і прадстаўлены яны падробкамі барацінак. Улічваючы што дадзеныя падробкі па сваім метрычным характарыстыкам адпавядалі арыгінальным барацінкам, яны спакойна ўспрымаліся на рынку як і афіцыйныя манеты.

2. У скарбах, якія складаюцца з білонавых шэлягаў, колькасць звычайных падробак невялікая – прыкладна 2 манеты з 100. У той жа момант, колькасць сучаўскіх фальшывых шэлягаў вагаецца ад 26 да 51 % агульнай масы скарба. Гэта складае ад ¼ да паловы скарба, верагодна казаць пра тое, што дадзеныя манеты паўнапраўна удзельнічалі ў грашовым абарачэнні па спецыяльнаму курсу.

2. Калі глядзець па колькасці літоўскіх барацінак, то ўзнікае пэўнае парушэнне прапорцый паміж віленскімі і брэсцкімі манетамі. Калі ў 1665 г. Віленская менніца адбіла манет на 2064400 злотых, супраць 23966 зл. на Брэсцкай, то ў 1666 г. Брэсцкая менніца выпусціла манет больш чым Віленская (2650169 зл. супраць 1592163 зл.). Але ў скарбе № 1 на 6 брэсцкіх шэлягаў (1665-1666) прыходзіцца 23 віленскага (тут і далей без уліку 1664 г.); у скарбе № 2 1 брэсцкі шэляг на 8 віленскіх; у скарбе № 5 толькі 2 брэсцкіх супраць 6 віленскіх; у скарбе № 6 толькі 3 брэсцкіх супраць 13 віленскіх. Між іншым, дадзеныя скарбы ўсе акрамя № 5 паходзяць з тэрыторыі Палесся, у склад якога ўваходзіць Брэст. Дадзеную дыспрапорцыю можна патлумачыць тым, што шэлягі Брэста вывозіліся на тэрыторыю Польшчы альбо Украіны. Для пацвярджэння гэтай версіі патрэбны аналіз шэляжных скарбаў з дадзеных тэрыторый. Альбо гэта тлумачыцца тым, што першасна закладзеная ў нумізматычныя каталогі класіфікацыя віленскіх і брэсцкіх шэлягаў памылковая і патрабуе перагляду.


1. Солид // Словарь нумизмата / Состав. Х. Фенглер, Г. Гирроу, В. Унгер; пер. с нем. М. Г. Арсеньевой; отв. ред. В. М. Потин. — 2-е изд., перераб. и доп. — Москва : Радио и связь, 1993. – С. 309-310
2. Повесть временных лет. [Электронны рэсурс] // Электронные публикации Института русской литературы (Пушкинского Дома), 2003–2010. – Рэжым доступу: http://lib2.pushkinskijdom.ru/tabid-4869 – Дата доступу: 13.08.2018.
3. Шиллинг // Словарь нумизмата / Состав. Х. Фенглер, Г. Гирроу, В. Унгер; пер. с нем. М. Г. Арсеньевой; отв. ред. В. М. Потин. — 2-е изд., перераб. и доп. — Москва : Радио и связь, 1993. – С. 370-371
4. Marzeta, D. Monety Polski Krolewskiej: Podręcznik dla początkującego kolekcjonera / D. Marzeta. — Lublin : Galeria u Marzęty, 2011. – 20 s.
5. Шуст Р. М. Шеляг / Р.М. Шуст // Енциклопедія історії України : в 10 т. / Інститут історії України. ; редкол. : В. А. Смолій (голова) [та інш.] – Київ, 2013. – Т. 10.– С. 627
6. .Харламповіч, П.В. Манетныя скарбы, знойдзеныя ў Беларусі, у зборах Беларускага дзяржаўнага музея / П. В. Харламповіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 1. Менск, 1927. – 303-344 с.


ПолесГУ

7. Фасмер, Р.Р. Список монетных находок / Р.Р. Фасмер // Сообщения ГАИМК. Т. II. Ленинград, 1929. – 281-324 с.
8. Архіў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. – Фонд № 3. Адз. зах. 82. Воп. 1.
9. Рабцэвіч В.Н. Манетныя скарбы Мядзельшчыны // Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Мядзельскага раёна. Мінск: выд. Белта, 1998. – 59–61 с.
10. Рябцевич В. Н. Монетные клады XVII и первой четверти XVIII вв. на территории Чернигово-Северской земли и Восточной Белоруссии // Нумизматика и сфрагистика, Т 1. Киев: изд. АН УССР, 1963. – 152 - 202 с.
11. Ryabtsevich V.N. Skarby monet z XVI-XVII wieku na terenie obwodu Brzeskiego i Grodzieńskego Bialorusskiej SSR // Prace i materialy Museum Archeologicznego i Etnograficznego w Lodzi. Seria numizmatyczna i konserwatorska. N 6. Lodz, 1988 – 211-239 s.
12. Сінчук І.І. Скарб медных манет XVII ст. з вёскі Данілавічы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. № 2. Мінск : выд. Беларуская Навука, 1995. – 67-72 с.
13. Wolski, C. Miedziane szelągi Jana Kazimierza Wazy z lat 1659-1667 / C. Wolski. – Lublin, 2016. – 528 s.
14. Федоров, Д.Я. Монеты Прибалтики XIII–XVIII столетий. Определитель монет: каталог-справочник / ред.-сост. Д. Я. Федоров. – Таллинн: изд. Валгус, 1966. – 422 с.
15. Monede si bancnote romanesti: каталог-даведнік/скл. O. Luchian., G. Buzdugan., C. C. Oprescu. – Bucuresti : Sport-Turism, 1977. – 429 p.
16. Costin, B. Pinzar, A. The coins of Moldavia and Vallachia / B. Costin, A. Pinzar [Электронны рэсурс]. 2003–2010. – Рэжым доступу: http://monederomanesti.cimec.ro. – Дата доступу: 09.08.2014.
17. Вальцверк // Словарь нумизмата / Состав. Х. Фенглер, Г. Гирроу, В. Унгер; пер. с нем. М. Г. Арсеньевой; отв. ред. В. М. Потин. — 2-е изд., перераб. и доп. — Москва : Радио и связь, 1993. – С. 41.
Полесу